Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЬЦЯГ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 2 Вільня, Субота 7-га ліпня 1928 г. Год 1

Сялянства і „Сялянская Ніва“.

З незапомных часоў, з часоў пераходу людзтва ад г. зв. першабытнага камунізму да іншых формаў грамадзкага жыцьця яно, *людзтва, было падзелена на клясы,* якія стала вялі між сабою зацятую вайну за ўплывы, за ўладу, за панаваньне. Уся гісторыя людзтва — гэта фактычна гісторыя барацьбы клясаў — і замены іх аднае другою. Гэтая *замена адбывалася поруч са зьменаю гаспадарчых адносінаў*, якія вытваралі новую клясу, расьцілі яе і прыводзілі да перамогі. Ад гаспадарчых адносінаў, *ад спосабу і прыладаў вырабу залежалі і суадносіны сілаў у грамадзянстве. Панавала тая кляса, якая мела ў сваіх руках гэтыя прылады вырабу.* Ня можна разглядаць гісторыі і самай барацьбы клясаў, ня прыняўшы пад увагу зьмены гаспадарчых суадносінаў, зьмены адных прыладаў вырабу другімі, бо яны надавалі характар і самому грамадзянству. Ня так даўно быў вынайдзены спосаб прымяненьня пары да ўжытку пры машынах. Гэта разам перавярнула датыхчасовы ручны спосаб вырабу тавараў, перамяніўшы яго ў фабрычны, а гэта надало сілы валадорам фабрык, буржуазіі, якая паступова і заняла першае месца ў грамадзянстве, усюды, найбольш пры дапамозе рэвалюцыі завёўшы свой парадак.

Буржуазія, поруч з іншымі зьменамі ў грамадзкім жыцьці, зьнясла ўсюды паншчыну, як форму ўлады папярэдняй, ўлады зямельнай арыстократыі, бо ей да фабрык ужо патрэбен быў не маўчалівы панскі падданы, а больш разьбітны, навет пісьменны чалавек. Такім спосабам сяляне былі вызвалены з паншчыны. Але з аднэй няволі яны папалі ў другую. Зямлі, на якой селянін працаваў і пры паншчыне, далі мала. З прыроджаным ростам — гэтае зямлі стала бракаваць што-раз больш і селянін мусіў урэшце кідаць вёску і ехаць у места шукаць сабе хлеба. Тут ён станавіўся на фабрыку, уліваўся ў рады *пралетарыяту*, клясы, ня маючай жаднай уласнасьці, а жывучай толькі з працы сваіх рук, з прадажы сваей працоўнай сілы той-жа буржуазіі. Пралетарыят—гэта новая кляса, якую вытварыла фабрычная вытворчасьць. Страшны вызыск працоўнай сілы ўзбагачваў буржуазію і нішчыў пралетарыят, які быў ад яе ў поўнай фактычнай залежнасьці. Голад і холад, надмерная праца—з другога боку навучалі пралетарыят змагацца за свае правы, а разам з тым і за правы тае клясы, з якое выйшлі—*за правы сялянства*.

Сялянства, стаўшыся нібы вольным, астаўшыся на сваіх надзелах, было аплецена буржуазіяй ня менш пралетарыяту. Запанаваўшая буржуазія, пакінуўшы сялянства на мізэрных вучастках, каб мець сабе рэкрутаў да фабрык, — налажыла на іх падаткі. Гэтыя падаткі налажыла яна ня толькі на зямлю, а таксама на кожную рэч, якую патрабуе купляць селянін, і без якіх ня можа абыйсьціся, як—соль, цукер, газа, тытун, жалезныя вырабы, розныя фабрычныя іншыя вырабы, адным словам на ўсё, што толькі можна. Селянін, нібы маючы якуюсь „уласнасьць“ — фактычна нічым цяпер ня розьніцца ад пралетара, які нічога ня мае. Гэтаму сьведчыць якраз факт уцёку сялянства ў места, у рады тога-ж самага пралетарыяту.

Селянін і пралетар—цяпер нібы родныя браты цягнуць аднолькавую паўгалодную долю, будучы пастаўлены ў такое палажэньне тою-ж самай сілай—буржуазіяй, якая валадае цяпер прыладамі вырабу і пануе над усім грамадзянствам.

Пралетарыят, жывучы ў цэнтрах культуры, местах ды ў большых масах разам, будучы прымушаны жыцьцём — пазнаў раней прычыну свайго няшчасьця, але пазнаў таксама і сваю сілу. Жыцьцё навучыла яго разумець, што ў барацьбе за прылады вырабу, у барацьбе ўсіх працоўных разам, барацьбе з вызыскам яго і ўсяго працоўнага народу—ён даб'ецца палепшаньня свайго палажэньня. Разам з тым пралетарыят зразумеў, што будучыня будзе за ім, што ён ідзе на зьмену ўжо аджываючай клясе буржуазіі і што гэта станецца абавязкава. На месца буржуазнай, неўпарадкаванай, ці як кажуць, анархічнай гаспадаркі, якая часта выкідае яго на брук, ён хоча завясьці сваю гаспадарку, гаспадарку ўпарадкаваную, ці сацыялістычны лад. Але ня толькі свае інтарэсы мае на ўвазе, а і інтарэсы сваіх братоў з вёскі, якія церпяць ад цяперашняга гаспадараваньня ня менш яго.

Думку барацьбы за лепшую будучыню, разам з пралетарыятам, зразумела і абяднеўшае, ці спралетарызаванае сялянства. Вырабілася агульная, як кажуць, праграма барацьбы—за зямлю і прылады вырабу. Пачалася арганізованая барацьба працоўных за свае агульныя правы і інтарэсы.

Ня так глядзіць на справу „Сялянская Ніва“. Яна хоча падчыркнуць і ўсюды гэта робіць, што сялянскія інтарэсы зусім асобныя ад работніцкіх, што сяляне мусяць ісьці асобна ад работнікаў і вышуквае такія мамэнты, якія дзеляць гэтыя часткі працоўных між сабой. Пускаючы ў ход „высокія“ словы, падлашчываючы сялянам, б'ючы проста на іх самалюбства,—„Сял. Ніва“ фактычна зьбівае сялянства з адзінае праўдзівае дарогі супольнай барацьбы з усімі працоўнымі за супольныя правы, дзеліць працоўных між сабою і гэтым самым капае роў для магутнага руху працоўных, ідучы поруч з буржуазіяй з яе правілам „divida et impera“ (разьдзяляй і валадай). Вось дзе ўгода нашых сельсаюзьнікаў, якія, выстаўляючы сваю нібы апазіцыйнасьць да цяперашняга ўраду, засланяюць вочы на фактычную ўгоду, на службу, навет не найгоршую, той-жа буржуазіі. Ці ня робяць нашы сельсаюзьнікі того-ж, што робяць іншыя буржуазныя спэкулянты ў другіх краёх, якія, карыстаючыся малою сьведамасьцю сялянства, таксама панатварылі розных сялянскіх саюзаў ды партыяў, якія нічуць ня розьняцца ад іншых буржуазных партыяў? Гэта—мужычкі „Его Велічества“, якія кажуць—„цар-бацюшка ўсё дасьць“.

Што „Сял. Ніва“ служыць буржуазіі—відно з артыкулу ў № 31, дзе падсалоджваючы сялянам і пускаючы ў ход дурман—гэтая газэціна паказвае, як на прыклад „пасьпеху“ сялянскага руху—на рух у Румынію, які вядзе... заядлы манархіста Маніў... Вось узор сялянскага павадыра для „Сялянскай Нівы“, вось куды хоча вясьці яна сялянства! Агіда і абурэньне выклікае гэтым угадовая газэціна, якая хоча разьбіць адзіны працоўны рух і скіраваць яго на шлях буржуазны.

Сяляне ў адказ на гэта толькі яшчэ шчыльней злучаць свае рады, каб у саюзе з работнікамі ісьці да сваей сьветлай будучыні, бо гэта толькі адзіны шлях.

Адбудаваньне нямецка-„аўстрыяцкай імпэрыі“ — пад новым — гаспадарчым аспэктам.

Цікаўным сплётам падзеяў і інтарэсаў амаль ня ўсей Заходняй Эўропы маленькая, абрэзаная з усіх бакоў, Аўстрыя, у якой ад даваеннай вялікай імпэрыі асталася блізу адна толькі „галава“,—зрабілася адразу тым цэнтрам, навакол якога пачало круціцца кола вялікай эўрапэйскай палітыкі.

Запраўды-ж паглядзеце, як цесна Аўстрыя зьвязана з найважнейшымі справамі і праблемамі (задачамі) эўрапэйскай палітыкі.

У цэнтральнай праблеме, навакол якой гуртуецца ўся паваенная гісторыя Эўропы, праблеме нямецкага адраджэньня—Аўстрыя, як ведама, іграе першарадную ролю: Справа злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай — адна з найбольш актуальных справаў, хвалюючых эўрапэйскіх палітыкаў бягучых дзён. А гэта адразу робіць Аўстрыю прадметам асаблівых „заходаў“ з боку Парыжа і Варшавы, ня кажучы ўжо аб іншых.

Канфлікт Італіі з Югаславіяй за ўплыў на Балканах,—магчымасьць вайны паміж імі асабліва высунулі Аўстрыю і яе ролю ў балканскай палітыцы: Італія і Югаславія аднолькава заінтарэсаваны ў Аўстрыі, прыязьнь якой дала-б вялізарныя стратэгічныя карысьці аднэй з ваюючых старонаў: яе паўдзённая Карынтыя іграе ролю „Бэльгіі“ ў спадзяваным маршы італьянскіх войскаў на Югаславію...

Ня менш заінтарэсавана ў Аўстрыі і трэцяя сільная палітычная група дзяржаваў Эўропы—Малая Антанта, якая ў апошні час асабліва зацікавілася прыязьню з Аўстрыяй—у зьвязку з завострыўшымся канфліктам сваіх сяброў з Вэнгрыяй, падняўшай справу перагляду граніцаў, накінутых ёй „Міравым Трактатам“, ды падтрыманай у гэтым Італіяй.

Такім чынам, у беднай, слабай, пазбаўленай усялякай палітычнай і эканамічнай сілы Аўстрыі быццам апынуўся адразу нейкі цэнтр, ад якога ў значнай меры залежыць вырашэньне ўсіх гэтых актуальных і вострых праблемаў бягучай палітыкі Эўропы.

Бо-ж пэўне, калі ў Вене перакрыжоўваецца столькі супярэчных інтарэсаў і ўплываў наймагутнейшых дзяржаваў, дык гэта якраз дае яе дзяржаўным кіраўнікам найвялікшую свабоду уласнай дзяржаўнай палітыкі... Патрэбная ім усім, Аўстрыя ў значнай меры вырашае і іх і свае ўласныя справы.—Справа толькі ў тым, наколькі спрытных мае яна палітыкаў... „З Вены, як піша адзін нямецкі журналіст, найлепш відаць усё, што робіцца ў эўрапэйскай палітыцы“. Вена, як у даўнейшыя часы, робіцца і цэнтрам эўрапэйскай палітыкі... Дык дзіва, што ў апошнія дні паўстала ў некаторых найбольш актыўных ды чуткіх дыплёматаў Цэнтральнай Эўропы думка аб адбудаваньні нейкага новага цэлага, у склад якога ўвайшлі-б дзяржавы, якія складалі да вайны Аўстрыяцкую Імпэрыю—з пэўнымі папраўкамі, — але цэлага, ведама-ж, маючага не палітычны, але гаспадарчы характар. Такім чынам, разьбітая ў вайне ды падзеленая ў выніку міру на складовыя часткі Аўстрыя адраджаецца ізноў пад відам „гаспадарчай уніі сярэдняй Эўропы“, ці „Наддунайскай Фэдэрацыі“, ці як там яшчэ.

Разгледзім бліжэй, аб што цяпер ідзе заінтарэсаваным дзяржавам ды — як стаіць справа ў апошні час. А таксама — якую-ж палітыку вядзе, які шлях—спаміж усімі гэтымі прапазіцыямі, уплывамі ды магчымасьцямі выбрала сабе сама Аўстрыя.

З папярэдняга агляду — ясна, што Аўстрыя мае на выбар два галоўныя шляхі: ці злучэньне з Нямеччынай, проці чаго дагэтуль працівіліся ўсе саюзьнікі пераможцы; ці ўваход у тую „Наддунайскую Фэдэрацыю“, ці ў якую іншую камбінацыю—у кампаніі з дзяржавамі Малай Антанты, куды цяпер усе асабліва пачалі ўцягіваць Аўстрыю, — якраз для таго, каб канчальна адцягнуць яе ад Нямеччыны.

Як ведама, Аўстрыя заўсёды цягнулася да злучэньня з Нямеччынай. Але аўстрыяцкія палітыкі рабілі гэта вельмі асьцярожна, каб не разгневаць сваіх апякуноў з Вялікай Антанты, якія не шкадавалі аўстрыяцкай „удаве“ грашовай дапамогі, каб толькі ня шукала сабе „новага мужа“—у Нямеччыне... Вялікая і Малая Антанта пільна ды грозна сачыла за „маральнасьцяй“ габсбургскай „удавы“. Ня гледзячы на гэта, Нямеччына з Аўстрыяй усьцяж надрыхтоўвалі злучэньне, павольна ды часткова даконваючы аб'яднаньне абодвух краёў, — ці то спыняючы паміж імі гаспадарчыя бар'еры, касуючы мыта, пашпарты, ці то ўводзячы аднолькавае заканадаўства — угалоўнае, цывільнае, гандлёвае, ці ўрэшце — яднаючыся прамысловымі арганізацыямі, фінансавымі сувязямі і г. д.

Але ў апошнія часы ў Сярэдняй Эўропе зьявіўся ды павёў сваю рашучую палітыку новы чыньнік, які, — зусім ня хочучы гэтага—адразу прысьпяшыў той працэс узаемнага аб'яднаньня двух чыста нямецкіх краёў, насяленьне якіх выразна імкнецца да злучэньня. Ці трэба паўтараць, што гэты чыньнік—фашыстаўская Італія.

Мусоліні, жадаючы разьбіць М. Антанту, каб ізаляваць Югаславію—з мэтай няўхільнай вайны з ёй з-за панаваньня на Балканах, зрабіў сабе з Вэнгрыі жалезны кулак, якім ён мог-бы пагражаць дзяржавам М. Антанты, ды націскае ўжо беспасрэдна і на Чэха-Славакію і Румынію.

Усё гэта змусіла гэтыя дзяржавы шукаць сабе новай апоры проці Італіі, паміма Францыі. І вось, найбольш спрытны і актыўны з кіраўнікоў М. Антанты, чэха-славацкі мін. Бэнэш, каля паўгоду езьдзіў па Эўропе, высьвятляючы небясьпеку з боку Італіі—у Парыжу, Лёндане, а ўрэшце і ў Бэрліне. У Бэрліне ён быў яшчэ першы раз з афіцыяльнай палітычнай місыяй.

Характэрна, што распачаў сваю падарожжу мін. Бэнэш якраз з Вены.

Цэлы рад фактаў кажа, што мін. Бэнэш абгаварваў у галоўных сталіцах Эўропы якраз справы новага групавога аб'яднаньня дзяржаваў Сярэдняй Эўропы, якое-б было здольна ўтрымаць націск гэтага новага чыньніка ў Сярэдняй Эўропе—Італіі.

На апошняй канфэрэнцыі Малай Антанты ў значнай меры высьветлілася тое, аб чым маўчаў Бэнэш: мэты яго падарожжы па Эўропе.

Канфэрэнцыя, як сьцьвердзілі ўсе міністры яе ўчасьнікі, найбольш увагі аддала якраз справе аўстрыйскай. Усе міністры выказаліся быццам проці злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай, але заявілі, што лічаць Аўстрыю краем, які натуральна ўваходзіць у гаспадарчую сыстэму Малай Антанты.

Асабліва ярка выразіў гэта югаслаўскі міністар Марынкавіч. Ен заявіў, што—„разьбіцьцём аўстра-вэнгерскай манархіі зьнішчожаны натуральны гаспадарчы саюз краёў, створаны гістарычным працэсам аб'яднаньня, дык нічога дзіўнага няма ў тым, дый ня можна рабіць з таго закідаў Малай Антанты, што яна вяртаецца да адбудовы даўнейшага палітычнага твору пад новым — гаспадарчым аспэктам“...

Інакш кажучы, ясна, што Малая Антанта рашуча гвалтам „запрашае“ Аўстрыю да ўваходу ў яе склад!

Але яшчэ больш цікаўным ды раскрываючым ужо канчальна акцыю мін. Бэнэша, зьяўляецца адказ аўстрыяцкага прэм'ера на гэтыя заявы міністраў Малай Антанты, дадзены ім у Венскім парляманьце.

Кс. Зэйпэль проста і ясна сказаў: „Малая Антанта гвалтам накідае Аўстрыі саюз, які мае мэтай трыманьне Аўстрыі здалёк ад Нямеччыны. Але Аўстрыя ніколі ня згодзіцца ўвайсьці ў такое гаспадарчае аб'яднаньне дзяржаў, у якім ня будзе прымаць учасьця Нямеччына“...

Прамова аўстрыяцкага прэм'ера высьвятляе, аб чым ідзе ў сучасны мамэнт спор паміж чаловымі палітыкамі з Сярэдняй Эўропы.

Малая Антанта высоўвае плян далучэньня Аўстрыі да сябе.

Нямеччына і Аўстрыя высоўваюць усё больш рашуча плян злучэньня паміж сабой так-званага — „Аншлюса“. А — як пэўны кампраміс сам сабой, высоўваецца трэці плян—стварэньня ў Сярэдняй Эўропе яшчэ вялікшага „гаспадарчага аб'яднаньня“ — усіх гэтых краёў з учасьцем Нямеччыны...

Прамова аўстрыяцкага прэм'ера была так спрытна збудавана, што выклікала задаволеньне ня толькі ў нямецкай, але і ў чэха-славацкай, а навет — і ў італьянскай і вэнгерскай прэсе!

Задаволеньне немцаў — зразумелае. Італьянская і вэнгерская прэса здаволены адмовай Аўстрыі на прапазіцыю М. Антанты.

Але найбольш важным і характэрным зьяўляецца голас чэха-славацкай прэсы (у

значнай меры кіраваны ў заграінчных справах самім Бэнэшам)!

Праская прэса супакойвае Аўстрыю, запэўняючы яе, што **Малая Антанта зусім не выключае Нямеччыны з сваіх плянаў стварэньня гаспадарчага аб'яднаньня ці супрацоўніцтва дзяржаваў Сярэдняй Эўропы: з натуры рэчаў такі найвялікшы гаспадарчы арганізм Сярэдняй Эўропы, як Нямеччына, папросту павінна ўвайсьці да такой кааперацыі".**

Трэба з асаблівай сілай падчыркнуць вялізарную важнасьць гэтага голасу чэхаславацкай прэсы; калі запраўды Чэха-Славакія кажа тутака ад імя ўсей Малай Антанты (што трэба прызнаць з пагляду на павагу гэтай прэсы і яе дыплёматычнага інсьпіратара), дык гэта значыць, што Малая Антанта ўжо паважна лічыцца з плянам такога цэнтральна-эўрапэйскага „гаспадарчага" аб'яднаньня, у якім—натуральнай сілай рэчаў — Нямеччына будзе ня толькі ўчасьнікам, але і кіраўнікам, а ўжо ў кожным разе і злучана так ці інакш з Аўстрыяй...

Дык ясна, што мін. Бэнэш, у часе свае вельмі доўгай візыты ў Бэрліне — куды заехаў пасьля гасьцінаў у Лёндане і Парыжу, вёў можа зусім ужо канкрэтныя гутаркі з нямецкімі палітыкамі і эканамістамі ў справе такога аб'яднаньня.

Астаецца толькі дадаць, што гаспадарчае аб'яднаньне няўхільна павядзе за сабой і вельмі значнае палітычнае збліжэньне ды супрацоўніцтва, у якім Нямеччына — ізноў сілай рэчаў—будзе йграць таксама ня менш дамінуючую ролю. А калі яшчэ ўспомніць аб тых усьцяж паляпшаючыхся гаспадарчых ды палітычных стасунках, якія ўстанавіліся між Нямеччынай і Францыяй, дык пабачым, што—увесь ход эўрапэйскіх падзей як быццам „на ўсіх парах" выводзіць Нямеччыну ізноў на тую ролю павадыра, ініцыятара і кіраўніка эўрапэйскага гаспадарчага і палітычнага жыцьця (буржуазнага!), якую адыгрывала Нямеччына перад вайной.

Ці здолее пры такіх варунках і стасунках надалей утрымацца акупацыя Надрэніі, як гэтага трэбуюць ужо, можа, толькі Польшча ды Бэльгія, хай зразумее кожны сам.

Прамова пас. Гаурыліка

у часе соймавай дыскусіі над урадавай амністыяй (21./VI. 1928 г.).

Высокі Сойм! Дзесяць гадоў, як існуе незалежная Польшча, а 7, як да Польшчы прылучаны землі Заходняе Беларусі. Польшча прышла да нас з агнём і мячом (голас: Гэта амністыя, а ня трылёгія Сенкевіча), няслá лёзунгі роўнасьці і вольнасьці, а дала надзеі, якія напоўнілі вастрогі беларускімі грамадзянамі так, як яшчэ ніколі ў нашай гісторыі. (Голас: А ў Расеі?). І вось, высокая Юбілятка хоча нарэшце ўшчасьлівіць гэтых вязьняў сваею амністыйнай уставай. Што да цэласьці ўставы аб амністыі, то ўважаю, што яна нам нічога не дае, і ня толькі нам, але і вязьням Польшчы, і калі-б гэта была найшырэйшая амністыя, то калі астаецца тая самая сыстэма праўленьня, калі астаецца тая самая сыстэма змаганьня Ураду з незалежніцкімі, грамадзкімі, нацыянальнымі і клясавымі імкненьнямі працоўнага народу, то ўсё роўна. Найлепшая амністыя выпусьціць сёньня вязьняў на вольнасьць, а заўтра гэтыя самыя вязьні будуць зноў увязьнены. (Голас: Пан ёсьць прадбачучым). Наш **Беларускі Сялянска-Работніцкі Клюб** уносіць да гэтай амністыйнай уставы наступныя папраўкі:

Арт. 3 прыймае наступную фармуліроўку: „пускаюцца ў няпамяць (забываюцца?) і прабачаюцца ўсялякія праступствы, зробленыя перад днём 20 чэрвеня 1928 году з прычынаў нацыянальных, грамадзкіх, рэлігійных і палітычных. Карныя расправы ў гэтых справах ня будуць пачынацца, а пачатыя скасуюцца. Даруюцца кары разам з усімі насьледзтвамі і дадатковымі карамі, правамоцна прысуджаныя за гэтыя праступствы, а не споўненыя ўчастцы, або ўцэласьці",

Арт. 4 і 5—скасоўваецца.

Арт. 6 прыймае наступную фармуліроўку: „Скасоўваюцца ўсе справы абвінавачаньня ў прыналежнасьці да арганізацыі „Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады", усе запаўшыя прыгавары, усе вынесеныя кары за прыналежнасьць да Грамады, падлягаюць прабачэньню і забыцьцю. Карныя расправы за прыналежнасьць да Грамады і зьвязаныя з гэтым расправы ў справах нібы (rzekomych) сьпіскаў Грамады, а так-жа ў нібы прыналежнасьці сяброў Грамады да Камуністычнай Партыі Зах. Беларусі ня будуць пачынацца, а пачатыя будуць скасаваны". (Голас: Гэта дэмакратыя (?): усё іншае скасоўваецца, а пакідаецца толькі сабе).

Пас. Гаўрылік. Галоўны націск кладзем на апошнюю папраўку, датычачую якраз Грамады. Пасол Ярэміч увёс ідэнтычную папраўку і ўгрунтаваў яе. Розьніца між намі тая, што пасол Ярэміч і яго партыя былі засаднічa проці Грамады, як арганізацыі і як сыстэму нашага змаганьня за свае грамадзкія і нацыянальныя правы. Яны былі проці Грамады. Так сьцьвярдзіў п. Каруза з гэтага ўгрупаваньня ў часе дыскусіі над бюджэтам Мін. Справядлівасьці. (Голас: Гэтых пусьціць, а яго замкнуць). Гэтым самым угрупаваньне Ярэміча прызнае якуюсь праступнасьць у дзеяньні Грамады. Я ж уношу папраўку да праекту ўставы дзеля таго, што ўважаю, як і цэлы працоўны Беларускі Народ, што ня можа быць і гутаркі аб якойсь віне Грамады (Голас: Рэвэляцыя), што людзі, якія ўваходзілі ў склад Грамады, спаўнялі свой абавязак, а калі ёсьць віна, то ня трэба гэтай віны шукаць ў Грамадзе, ня трэба яе шукаць на гэтых людзях, але на тых дзейніках, якія выклікалі працэс Грамады (Голас: Гэта значыць камуністаў).

Паўстаньне Грамады ёсьць такім натуральным фактам у нашым жыцьці, як натуральным ёсьць імкненьне кожнай жывой істоты, укінутай у воду, выплыць на бераг. Трэба ратавацца, гэта зусім натуральны одрух, бараніцца і ратавацца ад сьмерці і зьніштажэньня. Іменна так мусіў бараніцца, мусіў ратавацца працоўны Беларускі Народ. Грамада паўстала на гістарычнай аснове. Цэлая наша гісторыя, гэта адно непрарвнае пасма найстрашэньнейшага ўціску і вызыску. Падданства сялян, паншчына на беларускіх землях насіла форму барбарскага нявольн. Пазьней-жа, праз паўтара з лішнім сталецьці, над нашым народам гуляў бізун царызму. Дзікая самаволя царскіх чыноўнікаў, якія баранілі стану маемасьці абшарнікаў — польскіх магнатаў, стаялі на варце неаграцічанага вызыску белар. селяніна. Вызвольны рух 1905 г., у якім мае сваю старонку і сьведамы беларускі працоўны народ, быў здушаны ў крыві. Цар і царская рэакцыя хацелі закуць працоўныя масы ў дыбы яшчэ страшнейшай няволі.

Нядолю беларускіх сялян і работнікаў яшчэ ўзмоцніла сусьветная імпэрыялістычная разьня, а потым польская вайна проці Радавага Саюзу.

У гэтым часе нашы беларускія землі былі дзесяць раз абшарамі ваенных падзеяў, сталі разваленыя і спустошаныя, а жыхарства іх змушана да тулячкі на чужыне.

7 гадоў на беларускіх землях, знайшоўшыхся ў граніцах Польскай Дзяржавы, правіць польская буржуазія і польскае абшарніцтва. Зьмяняюцца ўрады, але ня зьменена кляса, фармуючая гэтыя ўрады так, што мы былі ўсьцяж пад буржуазнымі ўрадамі. Над трымя мільёнамі беларускага люду вісеў усьцяж гадамі ўзрастаючы паліцыйны і адміністрацыйны тэрор. Пад асłонаю ўладаў, войска і паліцыі, польскія крэсавыя абшарнікі, што-раз мацней заціскаюць на горле беларускага селяніна абору вызыску.

У беларускага селяніна выдзерта залітая яго крывёю і потам зямля, выдзерта так-жа і рэшткі надзеі, што атрымае хоць шматок зямлі (голас: Кажы пан аб амністыі). Зямельная рэформа праводзіцца такім спосабам, што скончыцца хіба за сотні гадоў. У гарадох з году на год ўрастаець вызыск тысячных работніцкіх масаў, адбіраюцца ў работнікаў здабытыя барацьбой правы. За найменшую пробу апору, за найменшую праяву барацьбы ў абароне сваіх правоў тысячы беларускіх сялян і работнікаў укінута за турэмныя краты. Тысячы барацьбітаў сялянска-работніцкай справы трымаюцца ў найстрашнейшых варунках, у холадзе і голадзе, зьдзекуючыся над імі фізычна і маральна.

Адначасна польскія буржуазныя ўрады ўзмоцнілі нацыянальны ўціск Беларускага народу, брутальна топчучы яго культурныя правы і патрэбы, зьнішчылі цалком культурна-прасьветную дзейнасьць сярод беларускіх масаў. У такім становішчы беларускім сялянска-работніцкім масам пагражала і паграджае поўнае зьніштожаньне, поўная заглада і здэнацыяналізаваньне. (Перарываньні). Адзін ваш чалавек, здаецца Грабскі, сказаў, што за 50 гадоў ня будзе ані аднаго беларуса. (Голас: Пану так здаецца). Вось аснова, на якой паўстала Сялянска-Работніцкая арганізацыя Зах. Беларусі і вялікая палітычная партыя „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада". Тысячы ўціскaных і вызысківаных людзей кінулася ў Грамаду, каб змагацца ў яе радох за свае правы і быт, за сваё поўнае грамадзкае і нацыянальнае вызваленьне. Грамада расла проста нябывалым тэмпам. Праз год існаваньня лічыла якіх 100.000 сяброў. Гэта было доказам, што паняволены і прыгнечаны Беларускі Народ уверыў у сваё вызваленьне і дарогу да гэтага ўбачыў у неўмалімай барацьбе і арганізацыі. Гэта доказ... (**П. Галыньскі.** Але што гэта мае да амністыі?). **П. Гаўр.** Тое, што да амністыі трэба далучыць пункт аб звальненьні Грамады. (**П. Галыньскі.** Усё іншае скасаваць, а Грамаду пакінуць). **П. Гаўр.** Гэта довад, што да Грамады належаў цэлы Беларускі Народ у Польшчы.

Вялізарны ўзрост Грамады належыць да часу, у якім Маршалак Пілсудскі зрабіў свой пераварот. Траўнявы пераварот ня выклікаў у працоўных масах аніякае ілюзіі. Змагаючыся, рады Грамады раслі і далей. Беларускія сяляне зразумелі, што „санацыйны" ўрад Маршалка Пілсудскага, які ўжо ў першых мінютах па абняцьці ўлады абапёрся на крэсавых абшарніках, ня прынясе нічога добрага нашым працоўным масам. Ачывістасьць спраўдзіла найгоршыя чаканьні. Па заядлай і пляновай кампаніі ўсей буржуазнай прэсы ўрад Маршалка Пілсудскага... уганяе Грамаду ў падзямельле, арыштоўвае тысячы яе дзеячоў, а суды засуджваюць грамадаўцаў на сотні гадоў вастрогу.

Маршалак. Пане пасол, прашу вярнуцца да парадку дня. У панскіх скрыптах няма мовы аб амністыі, хай пан яе кіне і пачне гаварыць на тэму.

П. Гаўрылік. Ад імя працоўных масаў Заходняй Беларусі (голас: пане Маршалак, гэта ёсьць за граніцамі дзяржавы).

Марш. П. пасол, прашу скончыць.

П. Гаўр. Заклікаю Высокі Сойм (голас: Што заклікаю?) унясьці да праекту амністыйнай уставы гэтыя нашы патрэбы: Ад гэтага прыняцьця будзе залежаць наша становішча пры галасаваньні над уставай.

Быў я адзін раз у сьледчага судзьдзі ў справе інтэрвэнцыі аб арыштаваных. Пытаю яго, калі ўрэшце скончыцца гэтая сыстэма, сыстэма масавых арыштаваньняў, вастрогаў і г. д. А ён яшчэ кажа: „Пане, трэба вычысьціць, і вось-жа мы чысьцім, гэтая сыстэма будзе трываць датуль, пакуль мы ня вычысьцім". Гэта мне прыпамінае фушэрскае лячэньне аднэй дзецкай хваробы, штосьці ў родзе эгзэмы, калі на целе зьяўляюцца струпы. Вонкавае лячэньне гэтай хваробы ёсьць бяз разультатаў. На мейсцы аднаго струпа вырасьце дзесяць. Вось-жа маладая Польская Дзяржава, маючая 10 гадоў, ёсьць хворая (вясёласьць), гэтую хваробу можна вылячыць ня вонкавымі плястырамі, але радыкальна: адабраньнем ад буржуазіі ўлады і адданьнем яе ў рукі сялян і работнікаў. Ваша амністыя нам нічога не дае.

Трэба фундамэнтальна зьмяніць сыстэму праўленьня, сыстэму гаспадарчай будовы краю.

На астатак, перачытаю тэлеграму, надышоўшую ад пасла Стагановіча, выданага судом і ўвязьненага цяпер: „Прашу інтэрвэньяваць у Сойме, прыяжджаць Горадня, пасол Стагановіч". Мы інтэрвэньявалі. Пасол Стагановіч і Беларускі Народ пераканаліся, што Сойм глухі, калі йдзе аб прадстаўнікоў сялян і работнікаў, што ён урадавы хаўрусьнік.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Апошняе слова Сымона Рак-Міхайлоўскага.

Паны судзьдзі! У сваім апошнім слове я абмяжуюся толькі спраставаньнямі і некаторымі выясьненьнямі.

Хачу закрануць тут справу **прэсы.** Хоць гэта ўжо, здавалася-б, зусім поўна і ясна зроблена было мною ў часе разгляду выдаткаў на прэсу Грамады—як аднаго з пунктаў абвінавачаньня—у пэўных днёх судовае расправы, але з прычыны таго, што пракурор Раўзэ у сваёй прамове ўсё-ж такі не абыйшоў моўчкі прэсавай справы Грамады, лічу сябе змушаным даць на гэтым месцы трохі выясьненьняў.

У свой час я даў суду на словах вычэрпваючае выясьненьне аб даходах і выдатках на прэсавае выдавецтва Грамады і ўсіх тых газэт, якія пракурор прыпісваў Грамадзе. На прапазіцыю старшыні суда я зложыў суду зусім падробны і ўматываваны абрахунак выдавецтва. Гэты абрахунак быў зроблены толькі і выключна толькі на падставе паказаньняў сьведкаў пракурорскіх — Васілеўскага, Левіна, Войцікавай, Рэшатава і Закрэўскага. Давёў я гэным абрахункам, што жаднае дапамогі газэты, збліжаныя па сваёй ідэалёгіі да Грамады, не атрымлівалі ніскуль—ні ад Куомінтангу, ні ад Комінтэрну. Даказаў я, што газэты, рэдакцыя якіх мясьцілася і месьціцца на Віленскай вул. 12 у Вільні, жылі і жывуць з падпіскі. Спадзяючыся, што суд пераканаўся ў гэтым і што суд можа згадзіцца з маімі вывадамі, лічыў я ўжо гэтую справу зусім вычарпанай. Але вось пракурор Раўзэ, прастудыяваўшы мае абрахункі, і спраўдзіўшы іх—як дапушчаю—з кнігамі друкарні Левіна, нібы знайшоў дробную памылку, а іменна, што № 8 „Нашай Справы" ад 20. XII. 26 г. у лічбе 7750 экз. быў адбіты не на 4-х, як паказана мною, а на 6-х старонках. У гэтым пракурор хоча падарваць праўдзівасьць маіх абрахункаў, а—значыцца — і маіх вывадаў. Але гэта ня ўдасцца пану пракурору! Яго закід тут—проста сьмешны. Тут памылка не мая, а самога-ж пракурора, або таго судовага сьледаваццеля, які ўкладаў пратакол агледзін кніг Левіна, а я-ж толькі мог карыстацца з копіяў актаў сьледзтва, якія былі мне ў свой час судовымі ўладамі дадзены і толькі на падставе судовых актаў—як адзіных судовых дакумантаў — і паказаньняў сьведкаў, як матарыялаў зусім годных веры, я ўкладаў свае абрахункі.

Але, калі ад гэнае пракурорскае папраўкі маглі-б агульныя выдаткі на газэту павялічыцца на якіх пару-сот злотых, то я з свайго боку сцьвярджаю на падставе зробленай п. Сьмяроўскім у рэпліцы ягонай заявы з паказаньнем № № і фармату газэт, што зьвялічаны фармат газэты з Віленскай 12 пачаў выходзіць ня з 1. VIII. 26 г., як паказана ў маім абрахунку, а з 1. XI. 26 г. А ад гэтага і той дэфіцыт прэсовы за $20^1/_2$ месяцаў—ад 1. VII. 25 г. да 15. III. 27 г. — у 13.000 злотых, як стаяла ў маім абрахунку, зьменшыцца ад гэтага на добрых 3—4 тыс. А з гэтага яшчэ больш становіцца годным веры, што гэты невялікі дэфіцыт мог за $20^1/_2$ месяцаў лёгка пакрыты платай за абвесткі, даходамі ад прадажы газэт на пасольскіх вечах і зьездах Грамады.

Узноў-жа тут зазначаю, што прэса з Віленскай 12, газэты, рэдакцыя якіх там зьмяшчалася, ня былі афіцыяльным органам Грамады, а толькі збліжанамі да ідэалёгіі Грамады. Газэты з Віленскай 12 пачалі выходзіць з 1921 г.; выходзілі яны і да выбараў у Сойм 1922 г. і ў час працы агульнага Бел. Клюбу ў Сойме, і пасьля падзелу яго і ўтварэньня Клюбу Грамады і ў часы працы Грамады і па заарыштаваньню паслоў і пасьля ліквідацыі Грамады і цяпер, і дагэтуль Віленская 12—гэта старая мясьціна рэдакцыі беларускіх газэт, найбольш пашыраных. Паступовы ўзрост у друкаваньні паасобных газэт і экзэмпляраў яе тлумачыцца зацікаўленасьцю ею нашых працоўных масаў ды пашырэньнем і паглыбленьнем беларускае сьведамасьці — нацыянальнай, сацыяльнай і палітычнай.

То—першая газэта, якая моцна стала на ўласныя ногі і дайшла ўжо была да 8,000 падпішчыкаў. Беларускае грамадзянства сьмела ўжо можа гэтым пахваліцца, а мы—паслы—можам быць гордыя з таго, што да гэтага ўсьведамленьня народных масаў мы ў найбольшай меры маглі прычыніцца.

Беларуская сьведамасьць народная расьцець. Грамада ўзварухнула нашыя працоўныя масы, народ прагне за сваей кніжкай — і мы, ужо седзячы ў вастрозе, радаваліся пашырэньню культуры беларускай на вёсцы. Ці-ж не найлепшым паказчыкам гэтага можа быць хоць такі факт; у 1907 г. календароў беларускіх разыйшлося ледзьве 1.500 экзэмпляраў, у 1912 г. — 2.000, у 1921 г. ад 2.000 да 3.000, а ў 1927 г. календароў-кніжак— 12 тыс., ды адрыўных — 8.000. І гэта лічбы ў 1927 г. толькі аднаго выдавецтва, а больш дзесяцёх тысячаў экз. разыйшлося яшчэ календароў і іншых двух выдавецтваў.

Але не магу тут не сказаць пару слоў аб агульным росьце беларускіх часопісяў. У той час, як 25 гадоў таму назад выходзіла толькі адна беларуская газэта, цяпер выходзіць у Вільні 13 часопісяў. Дыффэрэнцыя беларускае палітычнае мысьлі ды пашырэньне беларускага руху—прычына гэтага. Пераважае ў нашым народзе — і гэта зусім зразумела—думка радыкальна-левая. І калі орган гэтае думкі — газэты з Віленскай 12 — расходзіўся ў 1926 г. — за часоў існаваньня Грамады—у лічбе 8.000 экз., дык гэта зусім мя шмат было на $2^1/_2$ мільёны жывучых тут беларусаў. І адкуль магло паўстаць цьвярджаньне некаторых сьведкаў, што засыпалася вёска газэтамі? Гэта магло быць падыктавана толькі ненавісьцю нясумленных людзей да беларускага руху, да беларускага адраджэньня.

Бо калі-б навет узяць пад увагу ня толькі беларускую прэсу ўсіх кірункаў, а таксама і тыя газэты — не беларускія па духу, але, што таксама друкуюцца пабеларуску, — то і тады-б нельга было сказаць, што вёска засыпаецца ці засыпалася беларускімі газэтамі.

Але ці-ж толькі сьведкі з боку абвінавачаньня казалі тут Суду злосную няпраўду аб часопісях Грамады, нашай Грамады, гэтак зьненавіджанай і паліцыяй, і абшарнікамі, і выявдоўцамі і асаднікамі? Не, ня толькі яны казалі! Сам пракурор Раўзэ далёка тут — сказаць-бы далікатна — разьмінуўся з праўдай. Гаворачы аб канфіскатах беларускіх газэт, аб зачыненьні іх і карах на рэдактароў, пракурор сказаў, што адказныя перад правам рэдактары нашых газэт уцякалі заграніцу і дзеля гэтага ні адзін з іх ня быў пакараны, апрача Мік. Шылы. Сьцьвярджаю, што гэта — няпраўда. Камісарыят Ураду душыў канфіскатамі беларускую прэсу і суды не шкадавалі кар і кар судовых для беларускіх рэдактароў. І далёка не адзін з іх паеў вастрожнага хлеба ў Лукішках. З рэдактароў газэт, што выходзілі на Віленскай 12, адбылі кару: 1) Мікалай Шыла, засуджаны з арт. 129 на 1 год цяжкага вастрогу з пазбаўленьнем правоў, прасядзеў у Лукішках—раз з незалічаным яму прэвэнцыйным арыштам—$2^1/_2$ гады; 2) Антон Войцік, засуджаны з арт. 129 і 154 на 1 год вастрогу, прабыў у Лукішках 1 год і 4 месяцы; 3) Міхал Германовіч, укараны з арт. 129, прасядзеў у Лукішках 10 месяцаў; 4) Аляксандар Вільчыцкі, рэдактар „Беларускае Справы", адбыў кару ў Лукішках 6 месяцаў; 5) другі рэдактар тэй-жа „Беларускае Справы" Сымон Макулік, засуджаны з арт. 129, таксама быў трыманы ў Лукішках у працягу 10 месяцаў і г. д.

Вось гэта—праўда. Праўда аб рэпрэсіх на рэдактароў і на беларускія газэты, якія часта канфіскоўваліся навет за перадрукі з газэт польскіх. Ніхто за плячмі тых рэдактароў не хаваўся, бо яны былі і адказнымі і фактычнымі рэдактарамі, а кары, накладаныя на іх, добра ілюструюць адносіны ўладаў да беларускае прэсы. А той факт, што, ня гледзячы на частыя канфіскаты, якія руйнуюць выдавецтва, усё-ж такі беларускія радыкальныя газэты жывуць, даказвае, што **народ зразумеў вартасьць гэтай сваей прэсы і акуратнай падпіскай і ахвярамі падтрымлівае яе і надалей.**

Адным словам заяўляю, што засобаў на сваё утрыманьне прэса беларуская ніскуль не атрымлівала. Лічу гэтую справу вычэрпанай.

Пераходжу да **школьніцтва.**

У актах сьледзтва, на судовай расправе і ў прамове пракурора ўсё паўтаралася, што беларуская школа на нашых землях — гэта твор і акцыя КПЗБ. Школа, як і ўсе, чаго дамагалася Грамада, усё падганялася тут пад праграму КПЗБ — і падаткі, і школы, і асадніцтва, і самаўрады, і зямельнае пытаньне, і ўрад сялянска-работніцкі і інш. Разгледжу толькі школьніцтва. Школа і зямля—гэта найгалаўнейшыя патрэбы, для спаўненьня якіх ішлі мы ў Сойм на выбарах яшчэ ў 1922 годзе; тады, як не існавала тут яшчэ КПЗБ. З гэтых, як і з усіх дамаганьняў Грамады, народ наш ніколі не зрэзыгнуе.

Калі ўзяць справу беларускай школы ў Радавай Беларусі, то мы бачым — хоць-бы з польскае прэсы на падставе інфармацый з БССР, — што там існуе 4200 бел. пачатк. школ, 7 вучыцельскіх сэмінарый (пэдтэхнікумаў), унівэрсытэт; існуе навет 137 польскіх пачатк. школ і польская сэмінарыя. А што мы, беларусы, маем тут? Але ня буду тут параўноўваць, бо там і тут розныя ва-

рункі жыцьця, палітыкі, дзяржаўнага ладу. Возьмем Латвію, такую-ж „дэмакратычную“ Рэспубліку, як і Польшча. У Латвіі — як сцьвердзіў тут сьведка—пасол Флегант Валынец — на 35,000 беларускага насельніцтва ёсьць 35 урадавых белар. пачатк. школ, 1 беларуская ўрадавая гімназія. Калі-б той латвійскі маштаб прылажыць тут, то мы на $2\frac{1}{2}$ мільёна беларускага насельніцтва павінны мець у Зах. Беларусі 2,500 белар. урадавых пачатк. школ і 70 гімназіяў. А што мы маем? Коштам зьліквідаванай Грамады, якбы заплата за гэтую крыўду, адчынена нейкая пара беларускіх школ ды гэтулькі-ж двуязычных; а ў гэных школах вучыцялямі, як і раней, ёсьць толькі палякі. І надалей адбываецца палянізацыя беларускай дзятвы, якая пад пагрозай штрафаў—а гэта-ж цяпер ні для каго не сэкрэт — прымушана хадзіць у польскую школу. І гэта цягнецца ўжо 8 гадоў. Ці-ж ня дзіва, што народ наш, ратуючы сваю самабытнасьць, так горача і ўпорліва дамагаецца сваей школы? І ці-ж можна лічыць дзіўным, што дзіця, заганянае ў польскую школу, вучыцца дома па беларускім лемэнтару, або што адбываецца тайнае навучаньне пабеларуску. Народ наш не зрачэцца ніколі сваіх правоў і ён іх даб'ецца.

Пераходжу да справы **помачы вязьням.** Адкуль паўстаў гэты сэнтымэнт да палітычных вязьняў? Ня буду тут разводзіцца над гэтым, скажу зусім коратка. Хто дабіваецца ў нас сваіх правоў, хто дамагаецца школы— ужо той антыпанствовец, ужо — бальшавік. Ці-ж мала было ўкарана грамадаўцаў адміністрацыйным парадкам? Ці-ж мала ў часе ўсякіх выбараў — і да самаўрадаў і да Сойму — нерабывала і ёсьць у Лукішках грамадаўцаў? А як ня ўспомніць 1925 год? Не магу ня ўспомніць тут, што вясной 1925 году ў адным толькі Навагрудзкім ваяводзтве было заарыштавана генэралам Янушайцісам 1.386 асоб, якія найбольш актыўна выступалі ў акцыі складаньня дэклярацыяў за беларускую школу. Праўда, яны ступнёва звальняліся, але на мейсца іх пайшлі іншыя, пайшлі грамадаўцы. І Грамада, як на правінцыі, так і ў цэнтры, у меру сваіх сіл апекавалася палітычнымі вязьнямі. І гэта зусім зразумела.

Закідаецца мне ўдзел у дэманстрацыі ў Вільні ў часе галадоўкі палітычных вязьняў у Лукішках у сьнежні 1926 грду. Так, быў тады я на Лукіскім пляцу. А перад гэтым два разы быў у пракурора Штэймана, абгаварваючы там справу выпаўненьня некаторых і зусім слушных дамаганьняў вязьняў. Бо ці-ж ня слушным было, каб павялічыць спацыр людзям, каб сьвятло гарэла ў камэрах да 8—9 гадзіны, каб была палепшана ежа і т. д. Ці-ж ня мог задаволіць гэтага пракурор? Ці-ж ня мог—пайшоўшы на кампраміс — прычыніцца да спыненьня галадоўкі? Не! Пракурор гэтага зрабіць не хацеў. Суровымі рэпрэсіямі і кармленьнем вязьняў сілай — была здушана галадоўка. І нічога вязьням ня дана. Сваякі галадуючых не давалі спакою паслом, грамадзянства вымагала ратаваньня галадуючых, спыненьня галадоўкі, адбываліся дэманстрацыі. Але ці-ж мая прысутнасьць на дэманстрацыі можа быць падведзена пад арт. 102?

„Але Максімаўка“... — кажа пракурор Раўзэ — тут мне ўспамінаецца прыказка аб ваўку і лыку: няма чым ваўка вязаць, дык хоць лыкам.

Як сьмярдзючыя, гадкія жабы, што паскудзяць паветра, так і гэтыя Бабічы і малыя Малюткі надымаюцца, каб апаганіць чэсных людзей. Але ў сьвятле праўды і бязжаласнага аналізу гінуць усе злосныя выдумкі гэтых нясумленных істот.

Пракурор Раўзэ тут пры ўсіх перарабіў, падаў у іншым сьвятле, паказаньне навет таго Гурына, якога маральная вартасьць добра была тут абрысавана. Калі дапусьціўся гэтага пракурор, дык чаго-ж тады вымагаць ад сьведкаў з боку абвінавачаньня? А іх-жа тут было ня больш ня менш, як 174 прадстаўнікоў улады і паліцыі, больш сотні вывядоўцаў, асаднікаў ды канфідэнтаў яўных, ня кажучы ўжо аб тайных. Вось яна атмасфэра Суда.

Другіх пытаньняў высьвятляць ня буду. Зроблена гэта было многа ў працягу судовай расправы. Але не магу тут не адказаць пракурору аб маім нібы ўчасьці калісьці ў тварэньні Soldatenrat. Тут глыбока памыляецца пракурор. То ня былі нейкія лятучыя салдаткія саветы, а то было тварэньне мною Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Рады, якая мела сваім заданьнем утварэньне беларускіх вайсковых сіл. І каб у той час сьвядомасьць у нашым народзе была такая, як цяпер, дык невядома яшчэ, як улажыліся б палітычны абставіны тут на нашых землях і вялікае яшчэ пытаньне, ці меў-бы месца свае тут адбываючыся цяпер працэс.

Я той працы не выракаюся, наадварот гарджуся ўсей сваёй 20-ці гадовай працай і ў вайсковых арганізацыях, і ў справах школьных і палітычных. Ня было ні аднэй галіны ў беларускай працы, у працы адраджэнскай беларускай, дзе я ня прыймаў самага актыўнага ўчасьця. З усей сваей панярэдняй працы, як і з працы сваей у Грамадзе, магу быць горды, і магу гэтым публічна пахваліцца. А Грамада раскалыхала наш народ і гэта — яе вялікая заслуга.

Грамада пяройдзе ў гісторыю і гэта даець нам сілу цярпець няволю ў турме. З артыкулу 102 і 110 лічу сябе нявінным. Я скончыў.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Польска-літоўскія перагаворы ў Варшаве.

У Варшаве зноў распачаліся польска-літоўскія перагаворы ў справах эканамічных, камунікацыйных і транзытных. Перагаворы пакуль-што дасягнулі наступнага рэзультату. На першым паседжаньні трох камісіяў (эканам., камунікат. і транзыт.) літоўская дэлегацыя даручыла польскай праект умовы, датычучы жалезнадарожнага руху і паштова-тэлеграфічнай камунікацыі паміж Літвой і Польшчай. Праект гэты, па зазнаямленьні з ім польскай дэлегацыі, будзе пададзены дыскусіі ў адпаведных падкамісіях. Першым вызначана паседжаньне эканамічнай падкамісіі.

Аб польска-літоўскіх перагаворах у Коўне „Głos Prawdy“ ў 179 нумары падае, што старшыня польскай дэлегацыі ў Коўне Голувко, заявіў прэсе, што літоўскі гарантыйны пакт знаходзіцца ў такой фармуліроўцы, што яго могуць разглядаць толькі міністры заграніччых спраў у Крулеўцы. У сувязі з гэтым, дадае G. P. трэба чакаць хуткага выезду польскай дэлегацыі з Коўні.

Магчыма, што і старшыня польскай дэлегацыі ў Варшаве так-жа адгукнецца аб пададзеных яму літоўскіх праектах.

Магчыма, магчыма, літоўцы хіба „пруткія на мызу“, як кажа вёска.

Заканчэньне 26-га міжнароднага кангрэсу міру ў Варшаве.

29-га м. чэрвеня закончыўся 26 міжнародны кангрэс міру ў Варшаве. Пасьля цэлага раду мірных рэзалюцый, як ведама, маючых сілу толькі на паперы, узаемных прамоваў і падзякі польскаму арганізацыйнаму камітэту за „нязьмерна гасьціннае“ прыняцьце кангрэсу Польшчай, а асабліва яе сталіцай, гэты ня маючы ў сабе ні аднаго прадстаўніка працоўных масаў кангрэс, раз'ехаўся ведама хіба, як і куды — па панскі: на лепшыя курорты ў Польшчы.

Напады на вывядоўцаў сьледчага ўраду ў Варшаве.

Надовячы а 12 гадзіне ночы на адной з варшаўскіх вуліц на старшага вывядоўца, нейкага Баляслава Сэмэновіча, напала 2-х чалавек, пачаўшых яго біць.

У часе бойкі, як вывядовец пачаў страляць з рэвальвэру, напаўшыя кінуліся ўцякаць. Раненага ў галаву вывядоўцу перавязьлі ў адзін з камісарыятаў, адкуль была выслана „пагоня“. Але нападаўшых „і сьлед прастыў“, і пагоня вярнулася ні з чым.

Той-жа самай ночы некалькі чалавек „dotkliwie pobiło“ другога вывядоўцу, нейкага Мечыслава Эдэльштэйна. Аднаго з напаўшых вывядовец быццам затрымаў. Дык цікава, хто ж каго біў?

Аб'яднаньне вёсак і гарадоў.

27 м. чэрвеня аб'ядналіся дзьве буржуазныя польскія партыі: Партыя Працы і Саюз Направы Рэчыпаслітай ў партыю пад назовам „Аб'яднаньне вёсак і гарадоў“.

Гэта і ёсьць шкілет „адзінкі“. Старшыня новай партыі—пас. Косьцялкоўскі, часовы прэм'ер Ураду.

Завастрэньне забастоўкі.

Прэса падае аб завастрэньні забастоўкі прадзільных работнікаў у фабрыцы Пазнаньскага ў Лодзі.

Апошнімі днямі кінулі працу ткацкія работнікі і іншыя, што пагражае поўнаму спыненьню працы фабрыкі.

15 прац. дадатак для ўрадоўцаў.

Паседжаньне Рады Міністраў пад старшынствам новага прэм'ера Бартля прызнала выплату ў надыходзячым квартале 15 працэнтавага дадатку дзяржаўным ўрадоўцам. А дзе-ж перадвыбарныя абяцанкі ББ палепшаньня жыцьця бедным. Добры пачатак новага прэм'ера!

Заграніцай.

У чырвонай арміі.

З Масквы даносяць, быццам у Галоўным Штабе, як і ў іншых вышэйшых установах чырвонай арміі, спэцыяльным загадам стрыманы ўсялякія летнія водпускі. Некалькі найвышэйшых камандзіраў у арміі, як Варашылаў і інш., меўшыя намер ужо ехаць на лячэньне на Каўказ, затрымаліся на месцы. Ходзяць чуткі, быццам на камандных становішчах арміі маюць быць значныя зьмены, а таксама—значныя перагрупіроўкі войскаў. (Кур. Віл.).

Чарговыя вялікія манэўры чырвонай арміі на граніцах Польшчы і Румыніі.

У чарговых вялікіх манэўрах чырвонай арміі, якія ў гэтым летку ізноў маюць адбыцца на граніцах Польшчы і Румыніі дый маюць распачацца ў канцы ліпня, прымуць учасьце вельмі значныя сілы — вайсковыя адзінкі Смаленскага, Менскага, Кіеўскага і Адэскага ваенных акругоў.

Праграма манэўраў такая: Польшча поруч з Румыніяй нападаюць на СССР. Польшча робіць дэманстрацыю (фальшывы паход, маскуючы запраўдную мэту паходу) ў напрамку Менск-Смаленск, але вядзе наступленьне на Кіеў. СССР выстаўляе 2 арміі. З іх паўдзённая армія мае рашучую атаку румынскай арміі, папераджаючы яе пераход граніцаў СССР; паўночная армія мае задачай—адрэзаць ад сваей базы групу польскіх войскаў, кінуўшыхся на Кіеў.

Узнаўленьне стасункаў паміж Масквой і Нанкінам.

Камісарыят загран. спраў СССР распачаў перагаворы з прадстаўнікамі Кітаю ў Маскве ў справе стварэньня пры нанкінскім урадзе радавага пасольства.

Ці пойдзе паўдзённая армія на Мукдэн?

Перамога паўдзённых арміяў над паўночнай, як ведама,—яшчэ няпоўная: паўночная армія адступіла ў кірунку Манчжурыі, часткова перайшла яе граніцу, укрыўшыся ад удараў паўдзённых арміяў — пад ахову Японіі, якая абвясьціла Манчжурыю „нятыкальнай“ для ваеннай акцыі абедзьвюх ваюючых старонаў. Але пэўне-ж, што з такім палажэньнем спраў ня можа мірыцца ваеннае камандаваньне пераможных паўдзённых арміяў. Яно ня можа трымаць пабліж Пэкіну вогнішча ваеннай небясьпекі, усьцяж пагражаючае новай вайной.

І вось, адзін з галоўных павадыроў паўдзённых арміяў ген. Пэй-Шунг-Сі заявіў у спэцыяльным маніфэсьце, што з такім палажэньнем пераможцы мірыцца ня могуць ды ня хочуць. У хуткім часе яны пачнуць наступленьне проці тых атрадаў паўночнай арміі, якія яшчэ не перайшлі граніцы Манчжурыі. Маніфэст далей кажа, што паўдзённыя арміі лічаць неабходным — давесьці да пабеднага канца барацьбу з паўночнымі генэраламі. Калі-ж Японія будзе перашкаджаць у маршы паўдзённых войскаў, усьлед за пабітым, але недабітым праціўнікам, тады яна павінна будзе прыняць меры, каб ніводзін з тых генэралаў не астаўся на тэрыторыі Кітаю. Паўдзённае камандаваньне падрыхтоўвае цяпер паўмільёнавую армію—да рашучага бою.—Тады, маючы такую падставу, кітайскі ўрад распачне рашучыя перагаворы з манчжурскімі ўладамі аб разбраеньне паўночнай арміі. Калі-ж перагаворы не давядуць да мэты, тады трэба будзе рашыцца на апошні канчальны крок — наступленьне на Мукдэн.

Проці-польскія маніфэстацыі ў нямецкай Сілезыі.

Нямецкая прэса даносіць аб падрыхтаваньні вялікіх проці-польскіх маніфэстацыяў у Нямецкай Сілезыі—у знак пратэсту проці далучэньня часткі краю да Польшчы.

Хто такі новы нямецкі прэм'ер?

Пасол сацыял-дэмакрат Мюллер-Франкэн які цяпер стаў канцлерам Нямецкай Рэспублікі, гэта — той самы Герман-Мюллер, які быў прадстаўніком Нямеччыны на Міравой Канфэрэнцыі ў Парыжу ў 1919 г. і побач з другім дэлегатам Бэлем, падпісаў Вэрсальскі Трактат. Некаторыя газэты нямецкія бачаць у гэтым асаблівы знак, кажучы, што той самы Мюллер, які меў адвагу 10 гадоў таму палажыць свой подпіс пад цяжкім ды несправядлівым Трактатам, цяпер пакліканы гісторыяй, каб — канчальна скінуць гэты несправядлівы цяжар, накінуты на Нямеччыну.

Газэты пішуць, што канцлер Мюллер не здаволіцца тым, што парлямант адкіне „вотум недаверыя“ яго ўраду, які пэўне-ж запрапануюць нацыяналісты ды камуністы, але патрэбуе пазытыўнага выражэньня даверыя—пасьля дыскусіі над урадавым экспозэ.

Новыя маніфэстацыі і арышты камуністаў у Токіо.

29/VI Токійская паліцыя парабіла новыя масавыя арышты сярод камуністычных дзеячоў — за нарушэньне новых правілаў, выданых Кароннай Радай. Японская прэса піша, што ўлады маюць рабіць далейшыя арышты, каб пасадзіць усіх небясьпечных людзей у вастрогі — у часе маючых адбыцца ў хуткім часе каранацыйных урачыстасьцяў. Побач з тым, урад мае зачыніць усе органы прэсы ў краі, якія так ці інакш бароняць камуністычны рух і думкі.

Арышты камуністаў у Парыжу.

29/VI у Парыжу адбыліся тры вялікія мітынгі камуністаў, сабраўшыя па некалькі тысячаў учасьнікаў. Мітынгі скліканы пад лёзунгам пратэсту проці нявыплаты ўрадам прызнаных ужо парлямантам падвышак для ўрадоўцаў. Мітынгі сабраліся — ня гледзячы на забарону з боку ўлады, дзеля чаго былі разагнаны паліцыяй. Спасярод 200 арыштаваных затрымана толькі аднаго, які меў дакумэнты „ня ўпарадку“.

Зачыненьне камуністычн. органу ў Празе.

Пражскі акружны суд прыпыніў выхад органу чэха-славацкай камуністычнай партыі „Чырвонае Права“ (Rude Pravo)—за яго агітацыю на карысьць падрыхтаваньня так-зв. „чырвонага дня“, які камуністычная партыя мае намер арганізаваць, ня гледзячы на рашучую забарону яго ўладамі.

Арышты сярод вэнгерскіх камуністаў.

Сярод вэнгерскіх камуністаў улады зрабілі шмат арыштаў—у зьвязку з дэманстрацыямі, якія камн. партыя Вэнгрыі паладзіла пратэстуючы проці прысуду ў справе Бэла-Куна ў Вене.

Яны „перамаглі“.

(Маленькі фэльетон).

22-га мая... Ярэмка, п-асёл на Сойм, у глыбокай задуме, важна выпучыўшы жывот, хадзіў узад і ўпярод па сваім пакою.

Панавала цішыня...

Толькі нудны скрып ботаў Ярэмкі нарушаў яе...

Усё маўчала... Маўчалі сьцены...

— Гмм!—разважаў Ярэмка.—Сяньня судовы прыгавор над „Грамадаўцамі“. Судовы прыгавор над тымі, каго мы з Рабулаю сваім спрытным розумам „запякалі“. Пытаньне толькі, ці засудзяць. Вось гэта мяне мучыць. Бо што-ж, мы ў сваёй „Сялянскай Ніве“ крычалі, як маглі, што яны камуністы, што яны хочуць бальшавіцкага ладу і яшчэ шмат чаго, але што з гэтага, калі ніякіх рачовых довадаў ня мелі.

Крычаць мусілі... Трэ' было выконваць абавязкі...

Бяда будзе, калі не засудзяць. Хоць ты тады жывым лезь у зямлю. Будзе страшны сорам. Скажуць—давалі, давалі вам грошы, а вы нічога не зрабілі.

Але не пасьпела ў яго галаве праляцець гэтая думка, як раптам дзьверы адчыніліся і ў пакой ўляцеў увесь засопшыся, спацеўшы, з нявыказанай радасьцю на твары Рабула і крыкнуў:

— Ура, Ярэмка. Сьвяткуй парамогу. Радуйся! Няхай жыве суд!

— На 12, на 8, на 6 гадоў пазасуджвалі „Грамадаўцаў“—нашых ворагаў! Ха-ха-ха-ха! Харошый, брат, ураджай з нашага пасеву! Цяпер мы запануем! Давай пацалуемся!

Але Ярэмка ўжо ад радасьці нічога ня слухаў, а трасучы жыватом пашоў у прысядкі.

— Ну годзе, годзе так весяліцца! — пачаў спыняць яго Рабула. Трэба аб справе пагаварыць конкрэтна, і ўсеўся каля стала.

Ярэмка хутка супакоіўся, пакінуў скакаць і таксама ўсеўся каля Рабулы.

— Ну, што-ж, брат?—пачаў сэнатар. — Сяньня для нас такі „таржэственный“ дзень, дык трэба яго правясьці не абы як, каб мы аб ім доўга ўспаміналі.

— Я прапаную так: дзеля таго, што мы вельмі добра служым, то трэба апаражніць некалькі „службовых“ Хай мужыч'ё лье сяньня сьлёзы аб сваіх братох і сынох, а мы таксама будзем ліць, але ўжо ня сьлёзы.

— Хэ-хэ! Нічога проціў! адказаў, трасучы жывоцікам, Ярэмка. Я ўжо даўно прыгатаваў і ён пашоў выймаць з шафы „службовыя“ рознага калібру.

— Толькі вось яшчэ бяда, што мы далей рабіць будзем?—запытаў Рабула.

Мая прапанова такая—прадаўжаў сэнатар—трэба спыніць выдаваньне „Сялянскага Нівы“. Бо што-ж мы ў ёй пісаць будзем, калі „Грамады“ ўжо і духу няма.

— Не!—адказаў Ярэмка — на мой погляд, дык трэба прыпыніць газэту, але ня зусім. Будзем выпускаць яе час-ад-часу ну ў месяц, у два месяцы раз, для вока значыцца, і гэтым паказваць, што мы быццам запраўды для мужыкоў чагосьці дамагаемся.

А чаго? Ну, гэта ўжо ня іх справа.

Бо, бачыш, брат, не выдаваўшы зусім газэты, можна страціць уплыў у хамаў. А яны нам як раз і патрэбны пад час выбараў.

Трэба, ведаеш, скрозь ужываць хітрасьць, а не—дык бяда.

Яны хоць і хамы, але ўжо пачынаюць разумець ўсё патроху. І яшчэ вось што я думаю: трэба ў адным з першых нумароў „Сял. Нівы“ напісаць артыкул аб засудзе „Грамады“ і там паказаць, што быццам мы вельмі яе шкадуем. Хай мужыкі думаюць, што мы іх абараняем. А потым ведаеш — дадаў патаемна Ярэма—я нібы за Грамаду ў Сойме выступлю. Няхай на вока будзе таксама...

— Вітаю, вітаю гэніяльную думку—закрычаў з усяе сілы Рабула.—Што галава, то і розум. Ты, брат Ярэмка, можаш у добрыя ярэмцы заганяць гэтых хамаў. Ха-ха-ха! папляскаў яго па плячох.

— Ну, а цяпер „хлопнем“—прадаўжаў Рабула. Налівай! Ярэмка ўзяў чарку падвёў да вуснаў і сказаў:

— Ну, Рабула, даражэнькі сэнатар, будзь здароў! Мы, трэба сказаць свой абавязак выканалі ганарова! Тых, хто бараніў мужыкоў-хамаў, „запякалі“ на 12 гадоў. Трудна ім ужо будзе стуль вылезьці! Ха-ха-ха!

І мужыч'ё яшчэ доўга будзе спакойна сядзець. А мы на іх карку ехаць і бізуном падганяць. А калі сяляне і работнікі зноў захварэюць на арганізацыю, дык мы ўжывем супроць гэтай хваробы найлепшае лякарства—„Сялянскую Ніву“. Раз, раз і супакоім.

Дык няхай жыве вечная згода Ярэмкі і Рабулі! Няхай жывуць іх спрытныя розумы!

Мы перамаглі!!! А гэтую перамогу цяпер замацуем „службовай“. І ён, задраўшы галаву, перакінуў чарку.

Рабула пажадаў усяго найлепшага і таксама перакінуў.

Пачалося „умацаваньне“ „перамогі“.

Усё маўчала... Маўчалі сьцены...

Чуцён быў доўга стукат шкла.

А—т.

Наша хроніка.

Матуральныя экзамены ў Віленскай Беларускай Гімназіі. Мінулы школьны год закончыўся ў Віленскай Белар. Гімназіі матуральнымі экзаменамі. Правы матуры для сваіх абітур'ентаў Віленская Бел. Гімназія дабівалася шмат гадоў, але без пасьпеху. На перашкодзе заўсёды стаяў, як і гаварылася і пісалася афіцыяльна, „нізкі поэём навукова" Гімназіі. Нашыя вучні, па скончаньні Гімназіі, прымушаны былі—або бадзяцца па заграніцах для атрыманьня вышэйшае асьветы, або ставіць на ёй крыж. Матуральныя экзамены даюць права (нарэшце!) паступаць у польскія ўнівэрсытэты.

Экзамены на матуру адбываліся 16—26 чэрвеня ў памяшчэньні Гімназіі. У склад Экзаменацыйнае Камісіі, якую вызначыў Куратарыум, уваходзілі: Старшыня Камісіі—праф. Віленск. Унівэрсытэту М. Массоніус, Дырэктар і 9 вучыцялёў Гімназіі і 4 вучыцялі другіх дзяржаўных школаў. Да экзамену прыступіла 6 вучняў Віленскае і 6 вучняў Наваградзкае Белар. Гімназіяў. Усе, як пісьменныя, так і вусныя, экзамены адбываліся ў беларускай мове, апрача прадметаў палянічных, экзамен з якіх вучні складалі ў мове польскай.

На экзаменах 26 чэрвеня быў прысутным п. Куратар Віленскага Школьнага Вокругу, які выслухаўшы адказ вучняў Віл. Белар. Гімназіі, сказаў, што „такі добры адказ робіць гонар як вучыцялём, так і вучням Гімназіі".

У рэзультаце экзамэнаў матуру атрымалі ўсе 6 вучняў Віл. Бел. Гімназіі і 4 вучні Наваградзкае Гімназіі, іменна:

Віленская Гімназія: Будзьчанка Арына, Казлоўская Аўгенія, Рабіковіч Монус, Скурчанка Мар'я, Хворост Іван і Шчасны Пётра і

Наваградзкае Гімназія: Вэрбіцкі Аркадзь, Даманскі Мікалай, Кіта Барыс і Чатырчанка Вера.

З прадстаўленых Віленскай Бел. Гімназіяй вучняў здалі ўсе, г. ё. 100 прац. Вось на-ж табе і „нізкі поэём"! З Наваградзкай Бел. Гімназіі выдзержалі 80 прац.

Мусім адзначыць, што гэтыя экзамены былі „экстэрнам", а сталых правоў Гімназіі нашы, як ня мелі, так і ня маюць!

28 чэрвеня ў Гімназіі адбылася разьвітальная вечарына-канцэрт, ладжаны матурыстамі, а 29 чэрвеня традыцыйная гарбатка, у якой прынялі ўдзел увесь вучыцельскі пэрсанал і вучні 7 і 8 клясаў. Перад вечарынай Дырэктар Гімназіі, у прысутнасьці бацькоў і запрошаных гасьцей, прывітаў першых матурыстаў з добрым закончаньнем экзаменаў і пажадаў ім пасьпеху ў далейшай акадэмічнай працы, заклікаючы захоўваць сувязь з роднай Гімназіяй і працаваць на полю нацыянальнага і культурнага адраджэньня беларускага народу.

Пасьля адыгранага духавым аркестрам Гімназіі тушу, матурыстка А. Казлоўская ад імя сваёго выпуску дзякавала гр. Дырэктара за прывітаньне і наказвала сваім малодшым калегам, якія застаюцца ў Гімназіі, „працаваць так, як яны працавалі і любіць і берагчы Гімназію, як яны любілі і берaглі".

Громам воплескаў і паўторным тушам сабраньне вітала сваіх першых матурыстаў. На гэтым скончылася ўся ўрачыстасьць, замяніўшая сабою афіцыяльны акт, які ня мог адбыцца па незалежных ад Гімназіі прычынах.

З Беларускага Навуковага Т-ва. Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні атрымала першыя ахвяры на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні": 1) чыстага даходу з канцэрту-лекцыі „Вечар Славянскае Песьні", адбыўшагася ў Віленскай Беларускай Гімназіі 17 мінулага чэрвеня — 250 злотых і 2) ахвяры Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў в. Канюшоўчына, Баранавіцкага павету — 40 злот. Усім, хто прычыніўся да зьбіраньня гэтых ахвяр, Навуковае Т-ва складае шчырую падзяку.—Ахвяры можна прысылаць на тэрміновы рахунак „Дому Белар. Культуры ў Вільні" № 17 у Беларускім Каапэратыўным Банку:

Урад Навуковага Таварыства.

Урад Музэю ів. Луцкевіча дзякуе гр. А. Старовічу за прысланыя манэты.

Рэха Грамады. Надовячы адбылася Апэляцыйны Суд грам. Зьмітрука Аўласа з в. Лінікаў, Пастаўскага пав. Як падае „Słowo", гр. Аўлас быў у свой час засуджаны на 10 месяцаў вастрогу за тое, што ў часе паседжаньня гуртка Грамады ў яго хаце, быццам гаварылася „паніскаму воку" — паліцыянту: „мы тут самі ўлада" і „усуну" яго пры ўдзеле гаспадара з хаты.

Апэляцыйны Суд гэты прысуд зацьвердзіў.

Звальненьне з Лукішак. На гэтых днях звольнілі з Лукішак К. Смакізу, 100 прац. інваліда, які ў працэсе „Грамады" абвінавачваўся ў арганізацыі „боёвак". Смакіза моцна падупаў на здароўі і кажуць цяжка хворы.

Таксама на так даўно звольнены з турмы гр. Радзька з Дзісьненшчыны, кандыдат у спіску „Белар. Сял.-Раб. Аб'яднаньня" па Сьвянцянскай Акрузе.

Нелегальнасьць „Камуністычнага Маніфэсту Маркса й Энгельса". У вядомым беластоцкім працэсе цікава справа арышту гр. В. Пухальскага.

Рэч крылася ў тым, што ў час вобыску ў гр. Пухальскага знойдзена вядомая на ўвесь сьвет легальная кніжка: „Камуністычны Маніфэст Маркса й Энгельса".

І за гэтую кніжку Пухальскі, як высьніў у судзе яго адвакат Байль, прасядзеў аж 3 (тры) гады ў сьледчай турме і... пэўна ня раз даставаў „у пяты", як водзіцца на „Крэсах".

Стан пасеваў у Віленшчыне. Статыстыка падае, што стан пасеваў у Віленшчыне прадстаўляецца агулам зусім блага.

„У Жардэлі". 29 чэрвеня ў Жардэлі выехала з Наваградка надзвычайная камісія, дзеля „zbadania" прычын, з якіх у лесапілцы стала выбухаюць забастоўкі. Можа гэтая камісія выкрые яшчэ якую новую „Амэрыку" работніцкай нэндзы, апрача немагчымага вызыску іх капіталістамі?

Новая высылка Беларусаў. Прэса падае, што ад 5 да 8 ліпня адбудзецца выезд наступнай партыі работнікаў з Вільні ў Францыю. У сувязі з гэтым мае прыехаць ў Вільню спэцыяльная камісія. Вось, як палянізуюцца нашы „Крэсы": беларускую зямлю даюць асаднікам, а беларусаў ува ўсе бакі мятлою — каго ў Францыю, каго ў Латвію, у Амэрыку і г. д.

Драўняным купцом „хочацца". Віленскія драўняныя купцы зьвярнуліся да Міністэрства Промыслу і Гандлю з просьбай зьніжкі працэнтаў. У абшырным сваім мэморыяле яны наракаюць, што, дзякуючы ўзросту вывазу радавага дзерава на заграні́чных рынках, значна абнізіліся на яго цэны. А польскія купцы ня могуць збавіць сваіх цэнаў з прычыны „вялікіх падаткаў", дзякуючы чаму польскае дзерава, што-раз то менш купляецца на заграні́чных рынках, — кажа гэты „мэморыял".

Зусім магчыма, што ўрад зьмілуецца над гэтымі „беднымі" купцамі, бо-ж гэта „свае людзі".

Проці падбаўкі работнікам. Апошнімі днямі Ваяводзтва адкінула пастанову Віленскай Гарадзкой Рады аб 35 проц. павялічэньні платы гарадзкім работнікам, працуючым на каналізацыйных работах.

Безрабоцьце ў Вільні. Статыстыка падае, што 28 чэрвеня ў Вільні было 4.160 зарэгістраваных безработных.

Забастоўка плытнікаў. На рацэ Бугу забаставалі плытнікі, гонячыя дзерава ў Быдгошч. Бастуючыя жадаюць 50 процан. падвышкі.

Таямнічая банда ў Вільні. Віленская прэса падае, што апошнімі днямі цэлы рад віленскіх купцоў і прамыслоўцаў атрымаў пісьма ад нейкай таемнай банды (быццам амэрыканскай „чорнай рукі"). У гэтых пісьмах банда дамагаецца акрэсьленых і „грубшых" грошаў, пагражаючы ў разе адмовы сьмерцяй. Банда не называе людзей, якім маюць быць даручаны грошы, а толькі ўказвае месца, дзе яны маюць быць паложаны.

Пасьпехі беларускай радыкальнай прэсы. Што беларуская радыкальная прэса мае выключнае перад другімі газэтамі пашырэньне між працоўнымі масамі Зах. Беларусі—гэта хіба ўсім вядома. Але, аказваецца, што думкі, якія яна праводзіла ў Зах. Беларусі, нашлі шырокі водгук і за граніцамі Польшчы, там, дзе яшчэ знаходзіцца беларускі народ. Апошнімі днямі рэдакцыя дастала з Латвіі аднаднёўку „Праца".

Ужо самы назоў паказвае на найбліжэйшую ідэёвую сувязь новага органу з нашай прэсай. Зьмест аднаднёўкі пераконвае нас у гэтым яшчэ ў большай меры. Дух, ідэалёгія, тон, навет фразэолёгія аднаднёўкі ў-ва ўсім згодны з нашымі газэтамі. Вельмі прыемна адзначыць, што аднаднёўка падае некаторыя факты з жыцьця Зах. Беларусі, аб якіх мы ня можам даць вестак з прычын цэнзурных.

Горача вітаючы новы орган—выражаем глыбокае пераконаньне, што ён не астановіцца на аднаднёўцы, а разаўецца ў сталую газэту беларускіх сялян і работнікаў у Латвіі і найдзе такіх-жа гарачых і многалічных прыхільнікаў сярод працоўных, як і наша радыкальная прэса — і ўнясе сьвежы струмень у сьвядомае жыцьцё беларускіх працоўных масаў у Латвіі.

Няўдачы спадара на вёсцы. Ня так даўно Янка зрабіў мітынг у Вішневе, Ашмянскага павету, але, апрача людзей, якія прышлі, як на дзіва ў цырк, паглядзець на спадара—ніхто больш ім не пацікавіўся, аб гэтым маем спэцыяльную карэспандэнцыю. Хваліцель Янкі, „Kurjer Wileński", паведамляючы, што на мітынгу было каля 100 асобаў—дадае, што... „люднасьць ня цікавіцца пасольскімі мітынгамі".

Бязумоўна-ж ня цікавіцца такімі мітынгамі, як Янкаўскі! А „Kurjer Wileński", як кажуць, „удае дурня" і проста такімі дабаўкамі хоча сказаць іншае: „глупства ўсё-ж такі гэты Янка. Ні да танцаў, ні да ражанцаў. Няма чаго фактычна з ім і валаводзіцца".

Мёртвароджанае дзіця. Пэўна-ж ужо ўсім вядома, што ня так даўно нарадзіўся „Гаспадарчы Зьвяз", мёртвы ад самага нараджаньня. Што „Зьвяз" мёртвароджаны, ведама ўсім. Толькі не хацеў гэтага ведаць бацька гэтага дзіцяці — „блажэнны" Янка. Але гэта напомніла казку аб голым каралі. Усе бачылі, што „кароль голы", а кароль думаў, што ён у раскошным касьцюме.

Як ведама, у Вільні арганізуецца на восень г. зв. Паўночная Выстаўка. Беларускае Навуковае Т-ва рашыла выставіць тут беларускія народныя вырабы — і пачало рабіць захады перад Камітэтам Выстаўкі аб прыдзяленьні месца. Нейкім дзівам поруч з Навуковым Т-вам апынуўся „Гаспадарчы Зьвяз", ці то фактычна пад яго шыльдам Янка. Беларускае грамадзянства на адной з нарад выказала зьдзіўленьне такім станам рэчаў і з гэтага часу „Спадар" пачаў „хадзіцца" самастойна.

І вось аказваецца, што Камітэт Выстаўкі... адмовіў Янку ў прыдзяленьні месца, даўшы яго аднача́сна Навуковаму Т-ву. Пратэктары Спадара ўбачылі таксама, што яго дзіця „Зьвяз"—мёртвароджаны.

Няпрошаныя апякуны. Апошні нумар абшарніцкага „Słowa" (з 6-VII 28 г. № 151) у артыкуле „Dyskusja białoruska" падае пастановы так-званага рэгіональнага „кола" (гуртка?) соймавага і санацкага клюбу адзінкі Беларускіх земляў у справах беларускіх. Тут бачым проста як-бы цэлую праграму ў адносінах да беларусаў, якая па сутнасьці зьяўляецца прыгожым жэстам, маючым на мэце выклікаць пэўныя ілюзіі (пустыя надзеі) у дабрадзейства абшарнікаў і манархістаў з іх вернымі служкамі.

Але хто паверыць, што запраўды абшарнікі так проста і ахвяруюцца на карысьць сялян і работнікаў і дадуць ім тыя залатыя горы, аб якіх гаворыцца ў пастановах.

Ці ня хочуць яны наддзяржаць Янку Станкевіча, які ўжо паміраe зусім натуральнаю сьмерцю і ўдыхнуць яму новую веру, а то і заахвоціць, як дзікага пасла, уступіць да свайго клюбу?

Ну, няхай сабе, а беларускія сяляне і работнікі знаёмы з абшарніцкімі абяцанкамі і ня так ужо лёгка кінуцца на агонь.

У наступным нумары разьбярэм гэту справу больш падрабязна.

Сьмерць „Беларускага Дня". Як перадаюць, „Беларускі Дзень" ужо зусім закрыўся. Што-ж—„маўр зрабіў сваю справу, маўр можа выйсьці".

З Т-ва Бел. Школы.

Праца Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× 17./IV. г. г. Акунінаўскім Гуртком Т-ва Белар. Школы быў наладжаны спэктакль. Хоць артысты-аматары выступалі першы раз, але п'есы былі згуляны надта добра. Прысутных было да 200 асобаў, на ўсіх вечарына зрабіла вельмі прыемнае ўражаньне. Але трэба зазначыць і прыкрае зьявішча: частка хлапцоў з суседняе вёскі Сучкі, каб зрабіць падрыў, наладзілі сваю вечарыну: купілі 16 пляшак гарэлкі, нанялі музыканта і давай цешыцца пасвойму. Як яны весяліліся — ня трэба пісаць, а таксама на першы раз не падаем іх прозьвішчаў, бо спадзяемся, што пакінуць гэтае шкоднае дзела, а прылучацца да радоў тых лепшых сыноў нашае вёскі, якія ня толькі не атручваюць сябе гарэлкай, але аддаюць свае цяжка запрацаваныя грошы на падняцьце культуры і гаспадаркі нашага краю.

× Азярніцкі Гурток Т-ва Бел. Школы, Слонімскага пав., хацеў наладзіць спэктакль у м. Зэльве, Ваўкавыскага пав., але Стараста ня даў дазволу, трэбуючы п'ескі з дазволам міністэрства. Урэшце такі ўдалося атрымаць дазвол, але спэктаклю не маглі наладзіць, бо ў Зэльве ёсьць „коло млодзежы" і „Стшэлец", якія не далі магчымасьці яго наладзіць. Вясковыя хлопцы таксама ня прыйшлі, бо баяліся гэтых „асьветнікаў".

Падзяка.

Управа Гуртка Т-ва Белар. Школы ў м. Азярніцы, Слонімскага пав., шчыра дзякуе тым грамадзянам, якія ахвяравалі кнігі для бібліятэкі ў ліку 400 экзэмпляраў, якая існуе пры Гуртку Т-ва Белар. Школы ў м. Азярніцы.

Ад Мірскае Акружнае Управы Т-ва Бел. Школы.

Гэтым Мірская Акружная Управа паведамляе аб маючым адбыцца зьезьдзе сяброў Т-ва Бел. Школы Стаўпецкага павету 15 ліпня г. г. у м. Міры, у памешканьні Акружнае Управы (Міранская № 61), які пачнецца а 10 гадзіне дня.

Павестка дня: 1. Адчыненьне і прывітаньне зьезду і выбары прэзыдыума. 2. Даклад Акружнае Управы аб працы за мінулы час. 3. Даклад прадстаўніка Галоўнае Управы. 4. Даклад з мейсц. 5. Перавыбары Акружнае Управы і Нагляднае Рады. 6. Плян працы на будучы час. 7. Сяброўскія складкі. 8. Бягучыя справы. 9. Рэфэрат аб цвярозасьці.

Усе Гурткі Т-ва павінны дэлегаваць на зьезд ад 5 — 3 сяброў прадстаўнікоў, якім трэба быць паінфармаваным для справаздачы аб працы за мінулы час.

Мірская Акружная Управа
Т-ва Беларускае Школы.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Вынікі цемры.

(Ашмяншчына).

У двух вёсках Дзявекшыцкай воласьці цёмныя сялянскія жанчыны на „Язэпа" і „Юр'я" абкурвалі „сьвятым зельлем" у хлявох жывёлу. Каб гэтае абкурваньне лепей памагло, трэба пакінуць перавернуты гаршчок з жарам ў хляве. Дзякуючы гэтаму ў вёсцы Павіданцы згарэла 8 хат з хлявамі і сьвірнамі і 10 гумнаў. Апрача таго, згарэла: конь, карова і шмат другіх жывёлаў. А колькі згарэла зярна і іншай маемасьці, цяжка палічыць. У вёсцы Пашках згарэла 2 хаты з хлявамі і сьвірнамі і 7 гумнаў.

Вось якія вынікі цемры!

Я. Цярпігораў.

Наша моладзь.

(В. Каралеўцы, Вялейскі пав.).

У той час, як моладзь іншых вёсак вядзе культурна-асьветную працу, моладзь нашае вёскі займаецца п'янствам, ладзіць ігрышчы, дзе б'юцца да паўсьмерці. Кніжак і газэт купляць ня хочуць, бо кажуць няма грошай. Сьмяюцца з таго, хто чытае.

Час апомніцца і глянуць на мінулае, агіднае жыцьцё, час кінуць яго назаўсёды. Пара стаць у рады барацьбітаў за родную культуру, за лепшае жыцьцё для сялян.

Вясковы.

Навука ў польскай двуязычнай школе.

(М. Острына, Лідзкага пав.).

У нашай школе, апрача польскай мовы, „існуе" беларуская. Але, як яна існуе—вось пытаньне?

Вучыцелька перадусім ня ведае зусім беларускае мовы, бо прыехаўшая дзесь аж з Пазнані, ці-што. Калі і навучылася якіх два ці тры словы беларускія, дык яна іх знарок так перакручвае, каб выклікаць у вучняў сьмех і гэтым ганьбіць беларускую мову. У працягу цэлага году вучні абсалютна нічаму не навучыліся, апрача „proszę pani", „pani nauczycielka" і г. д.

Адным словам, польскія вучыцялі сеюць „культуру" паміж беларускіх дзяцей!

М. Бедны.

Вялікае сьвята.

(Дзісеншчына).

У дзень 1-га мая, у дзень сьвята працоўных у м-ку Глыбокім, ня гледзячы на пільнае сачэньне паліцыяй, у розных мяйсцох былі выкінуты чырвоныя штандары з надпісамі: „Прэч з фашыстоўскім тэрорам!" „Прэч суды і паліцыю!" „Жадаем амністыі для палітвязьняў!" і г. д.

Работнікі, а пераважна працоўная моладзь, 1-га мая не працавалі, хадзілі ў сьвяточных вопратках, з добрымі настроямі, чуючы нешта радаснае на сэрцы. Але ня ўсьпеў надыйсьці вечар, як да нас наехала процьма паліцыі, якая праз некалькі гадзін вывязла з сабою каля 30-х хлапцоў. Аднак, „po ścisłym badaniu" праз 5 гадз. яны ўсе вярнуліся дамоў.

Вось дзе лёс! Бадаюць без канца!

Л. Няшчасны.

„Рэалізацыя языковых законоў" на „Крэсах Усходніх".

(Вёска Карчова, Цырынскае гміны, Наваградзкага павету).

У 1926 годзе жыхары нашай вёскі зложылі дэкляарацыі на ўрадовую беларускую школу. Як-бы ў адказ на гэта ў 1927 г. прыехаў да нас з інспэктарату нейкі п. Сабінеўскі, які ашуканствам заставіў падпісацца некалькі сялян на няведамых па зьместу паперках. Пасьля даведаліся, што гэта былі напісаныя Сабінеўскім зрачэньні ад пададзеных дэкляарацыяў. Справа гэтая разглядалася на сходзе Г-ка і была занесена ў пратакол.

Польская школа заставалася і надалей, хоць у 1927-8 шк. г. былі зложаны дэкляарацыі на патрэбны лік дзяцей. На 1928-9 шк. г. зложаны ізноў дэкляарацыі на 48 дзяцей.

Але зараз-жа нанова зьявіўся п. Сабінеўскі з тэй-жа мэтай, што і ў 1927 г. І гэтым разам прымусіў ён падпісацца аднаго з тых-жа сялян, быццам для зацьвярджэньня подпісу.

Але селянін, успомніўшы леташняе ашуканства, зажадаў паказаньня паперкі, на якой ён падпісаўся. Сабінеўскі заняў лапамі і толькі сілком удалося адабраць падпісанае зрачэньне. Дык вось як рэалізуюць у нас „языковыя законы", тлумачачы гэта „бракам фармальнасьцяў". Вожык.

Паштовая скрынка.

Блізкаму. Пішэце выразьней ды на аднэй старонцы. З прысланага скарыстаем. — **Прысутнаму.** Скарыстаем.—**Усім карэспандэнтам.** Пішэце, якія прадбачацца ўраджаі, у зьвязку з такой пагодай.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Клаўсуць.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.